УДК 377(476)«1976–1985»

Н. М. Якуш, дацэнт (БДТУ)

# ПАЛІТЭХНІЗАЦЫЯ АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ І ПРАЦОЎНАЕ ВЫХАВАННЕ ВУЧНЁЎСКАЙ МОЛАДЗІ Ў 1976–1985 ГГ.

У артыкуле аналізуецца сістэма прафесійнай арыентацыі школьнікаў на пэўны род працоўнай дзейнасці, развіцця іх дапрафесійнай і прафесійнай падрыхтоўкі ў сельскай агульнаадукацыйнай школе, стварэння міжшкольных вучэбна-вытворчых камбінатаў.

The article examines the processes of adaptation of agricultural vocational education in accordance with the level of mechanization in agriculture and the problem of development of integrated and continuing education, taking into consideration the pre-vocational and vocational education of agricultural machinery operators in rural general schools.

In this respect, improvement of material and technical facilities of secondary schools, vocational guidance system, forms and methods of labor education for school pupils are investigated..

**Уводзіны.** У перыяд 1976–1985 гг. партыйным и савецкім кіраўніцтвам Беларускай ССР надавалася вялікая ўвага і прымаліся значныя захады па стварэнню і ўдасканаченню сістэмы падрыхтоўкі кадраў масавых прафесій для калгасна-саўгаснай вытворчасці і іх замацаванню на вёсцы. У гэтым накірунку можна вылучыць цэлы комплекс мер, звязаных з прывядзеннем зместу прафесійна-тэхнічнай адукацыі працаўнікоў вёскі ў адпаведнасць узроўню механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, пашырэнню сеткі сярэдніх сельскіх прафтэхвучылішч і іх філіялаў у гаспадарках, уцягванню працаўнікоў у кружкі агразаатэхнічнага ўсеагульнага навучання, удасканаленню курсавой падрыхтоўкі калгаснікаў і саўгаснікаў у навучальных цэнтрах Дзяржкамсельхазтэхнікі БССР. Комплексны падыход да праблемы адзінага і непарыўнага працэса навучання працаўнікоў вёскі сталяваўся на развіцці дапрафесійнай і прафесійнай падрыхтоўкі механізатараў у сельскай агульнаадукацыйнай школе.

**Асноўная частка.** XXVIII (1976 г.) і XXIX (1981 г.) з’езды КПБ, XVII Пленум ЦК Кампартыі Беларусі (1985 г.) паставілі перад партыйнымі камітэтамі рэспублікі, партарганізацыямі школ, прадпрыемстваў і гаспадарак задачу працоўнага выхавання моладзі шляхам аб’яднання намаганняў навучальных устаноў, працоўных калектываў, грамадскаці і сям’і. Прычым гэта задача разглядалася як з пазіцыі інтарэсаў развіцця вытворчасці, так і станаўлення асобы, фармавання светапогляду і актыўнай пазіцыі моладзі [1].

Выкананне рашэнняў з’ездаў і пленумаў ЦК КПБ спрыяла стварэнню ў рэспубліцы цэласнай сістэмы прафесійнай арыентацыі школьнікаў на пэўны род працоўнай дзейнасці, пераўтварэнню гэтай сістэмы ў арганічную частку ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу, паглыбленню палітэхнізацыі агульнаадукацыйнай школы. Працоўныя і палітэхнічныя асновы сельскай агульнаадукацыйнай школы Беларусі былі закладзены ў 1971–1975 гг., калі ва ўмовах пераходу да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі на вёсцы была ажыццеўлена праграма будаўніцтва новых школьных будынкаў, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы і пераабсталявання класаў, кабінетаў з улікам карэннай перабудовы працоўнага навучання школьнікаў IX–X класаў. У гэтыя ж гады пачаўся першы этап пераходу школ на новыя праграмы, якія адлюстроўвалі асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай навукі, павялічвалі ўдзельную вагу лабараторных і практычных заняткаў, экскурсій. Школы займаліся перабудовай навучання так, каб іх выхаванцы атрымлівалі веды навуковых асноў вытворчасці, разумелі яго галоўныя прынцыпы.

Надалей паўставала задача павышэння эфектыўнасці працоўнага навучання і прафарыентацыі праз умацаванне шэфскіх сувязей і пастаянных кантактаў працоўных калектываў гаспадарак, сельскіх ПТВ са школамі дзеля ўмацавання іх тэхнічнай базы, удасканалення навучальнага працэсу, стварэння сеткі стацыянарных лагераў працы і адпачынку. Былі створаны абласныя міжведамасныя саветы па прафарыентацыі моладзі, якая вучыцца, раённыя камісіі прафесійнай арыентацыі навучэнцаў і садзейнічання працаўладкаванню выпускнікоў сярэдніх школ, арганізаваны вучэбна-метадычныя кабінеты ў школах па арыентаванню школьнікаў на прафесіі сельскагаспадарчага профілю.

Плённа і паказальна дзейнічалі ў гэтым накірунку партыйнагаспадарчы актыў, кіраўнікі калгасаў, саўгасаў і школ Шаркаўшчынскага раёна. Кожная сярэдняя і васьмігадовая школа заключыла канкрэтныя дагаворы-мерапрыемствы аб садружнасці са сваімі шэфамі пры рашэнні задач паляпшэння працоўнай падрыхтоўкі школьнікаў. Большасць калгасаў і саўгасаў стала сумесна со школамі клапаціцца аб забеспячэнні школьных майстэрняў сельскагаспадарчай тэхнікай, прыладамі і прыстасаваннем. У раёне ішло сацыялістычнае спаборніцтва сярод сельскіх Саветаў, прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў за стварэнне трывалай матэрыяльнай базы школ і лепшых умоў для паспяховага навучання і выхавання. За 1978–1980-я гг. гаспадаркі і прадпрыемствы раёна ініцыятыўным

спосабам пабудавалі 6 школьных будынкаў і інтэрнатаў, 4 майстэрні, 7 жылых дамоў для настаўнікаў, абсталявалі ў большасці школ плёначныя парнікі, кабінеты па працы для I–III класаў, сталярныя і слясарныя майстэрні, кабінеты прафесійнай арыентацыі па асновах сельскагаспадарчай тэхнікі для IV–VIII класаў [2].

Актыўную працу па забеспячэнню ўдзелу грамадскасці і прадпрыемстваў у стварэнні трывалай базы працоўнага навучання школьнікаў правялі ў Мастоўскім раёне. Калгасы, саўгасы, прамысловыя предпрыемствы аказалі школам дапамогу на сумму больш за 50 тыс. руб., прынялі ўдзел у абсталяванні кабінетаў працы, пашырэнні плошчаў прышкольных вучэбна-вопытных участкаў, будаўніцтве цяпліц, арганізацыі трусаводчаскіх ферм. Вынікі працы раёна сталі падставай для распрацоўкі Гродзенскім абласным камітэтам партыі комплекснай праграмы працоўнай падрыхтоўкі школьнікаў ва ўмовах усеагульнай сярэдняй адукацыі [3].

Сумесная праца гаспадарак і школ па развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы дазваляла ў шэрагу выпадкаў арганізаваць паглыбленае працоўнае навучанне сельскіх школьнікаў. Напрыклад, у Беражноўскай СШ Столінскага раёна калгас абсталяваў кабінет для тэарэтычных заняткаў па трактарах, майстэрні для выканання практычных і мантажна-дэмантажных работ, гарадок па правілах дарожнага руху, трактарадром, пабудаваў гараж на 7 адзінак тэхнікі, памывачную ўстаноўку, перадаў школе 2 трактары Т-74, 3 – МТЗ-50. Гэта і дало мыгчымасць наладзіць працоўнае навучанне школьнікаў Беражноўскай школы па наступных накірунках: у кабінеце-лабараторыі праходзяць урокі працы пачатковых класаў; хлопчыкі IV–VIII класаў займаюцца тэхнічнай і сельскагаспадарчай працай, а дзяўчынкі – сельскагаспадарчай і абслугоўваючай; вучні IX–X класаў вывучаюць трактары, тэхналогію механізаваных работ і асновы агратэхнікі палявых культур [4].

Галоўным накірункам дзейнасці па ўдасканаленню працоўнай падрыхтоўкі і выхаванню сельскіх школьнікаў стала стварэнне міжшкольных вучэбна-вытворчых камітэтаў (ВВК), з выкарыстаннем у гэтых мэтах пунктаў і базы прадпрыемстваў Белсельгастэхнікі, стварэннем калгасамі, саўгасамі, станцыямі тэхнічнага абслугоўвання ў гэтых камбінатах цэхаў, участкаў, кабінетаў і лабараторый у якасці сваіх структурных падраздзяленняў. Менавіта прадпрыемствы і гаспадаркі забяспечвалі камбінаты неабходнымі для працы і навучання тэхнікай, гаруча-змазачнымі матэрыяламі, камплектуючымі вырабамі.

Непасрэднае кіраўніцтва стварэннем у сельскай мясцовасці сеткі міжшкольных вучэбных камбінатаў і ўдасканаленнем іх працы ўзялі на сябе райкамы партыі. Па іх заданнях Саветы народных дэпутатаў вызначалі профілі кожнага камбіната з улікам запатрабаванняў раёнаў у кадрах масавых сельскагаспадарчых прафесій і магчымасцямі працаўладкавання выпускнікоў. Для каардынацыі намаганняў розных арганізацый пры райкамах партыі ствараліся штабы на чале з сакратарамі РК КПБ. Актыўна працавалі ў гэтым плане Іванаўскі, Рагачоўскі, Нясвіжскі і іншыя раённыя камітэты КПБ.

У ліку лепшых міжшкольных ВВК рэспублікі стаў Сноўскі. Калі ў 1976 г. падрыхтоўка старшакласнікаў у ім вялася па 4 прафесіях, то ў 1979–1980-я гг. – ужо па 14. Адпаведна профілям навучання камбінат меў 12 кабінетаў, цэхаў і майстэрней, якія былі забяспечаны навейшымі па часе ўстаноўкамі, прыборамі, інструментамі, новымі маркамі трактараў, камбайнаў, сельгасмашын. Ужо першы выпуск паказаў высокую эфектыўнасць працоўнага навучання ў гэтым камбінаце. У 1977/1978 навучальным годзе 316 вучняў IX–X класаў раёна атрымалі на Сноўскім камбінаце прафесіі трактарыста, швяі-матарысткі, аператара машыннага даення, слесара-рамонтніка сельгастэхнікі. З іх пайшлі працаваць па атрыманых спецыяльнасцях 143 чалавекі, паступілі ў тэхнікумы – 34, вузы – 26, працягнулі прафесійную адукацыю ў СПТВ, ГПТВ – 113 [5]. Трэба пазначыць, што Сноўская СШ, Сноўскі міжшкольны вытворчы камбінат і сацыяльна-культурная база калгаса імя Калініна Нясвіжскага раёна ўяўлялі сабою адзіны вучэбна-вытворчы комплекс, які функцыянаваў як цэласная сістэма сродкаў і метадаў выхавання падрастаючага пакалення, выступаў новай формай узаемадзеяння сяла і школы.

Міжшкольныя сельскія вучэбна-вытворчыя камбінаты атрымалі ў Беларускай ССР шырокае распаўсюджванне і сталі асноўнай формай працоўнага навучання старшакласнікаў у 1970–1980-я гг. Сапраўднымі цэнтрамі практычнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі вучняў да працы і свядомага выбару прафесіі былі Гадзілавічскі ВВК Рагачоўскага, Тучанскі – Клецкага, Роскі – Ваўкавыскага, Суткоўскі – Лоеўскага раёнаў [6].

У цэлым стварэнне сельскіх міжшкольных камбінатаў на Беларусі ва ўмовах, калі вясковыя школы станавіліся малалікавымі і ў іх амаль не было паралельных старэйшых класаў, мела вялікае значэнне для далейшай палітэхнізацыі навучальнага працэсу. Па-першае, сельскія міжшкольныя ВВК дазвалялі эканамічна выгадна і педагагічна мэтазгодна сканцэнтраваць у адным месцы адпаведную тагачасным тэхнічным патрабаванням базу: кабінеты для тэарэтычных заняткаў, лабараторыі і майстэрні – для практычных. Па-другое, ва ўмовах такіх камбінатаў з'явілася магчымасць рацыянальна выкарыстаць патэнцыял лепшых выкладчыцкіх кадраў, і па-трэцяе, у іх былі прадстаўлены больш шырокія, чым у школе,

магчымасці азнаямлення вучняў з навуковымі асновамі сельскагаспадарчай вытворчасці і яе эканомікай, бо многія камбінаты мелі добра наладжаную сувязь навучання з самым перадавым сельскагаспадарчым вопытам рэспублікі.

Між тым у аналізуемы перыяд большасць сельскіх міжшкольных камбінатаў дэманстравала і многа недахопаў перыяду свайго станаўлення: памяшканні, дрэнна прыстасаваныя да арганізацыі вучэбнага працэсу; навучанне на спісаных аўтамабілях і трактарах старых марак, якія не даюць магчымасці выканаць усю праграму падрыхтоўкі ваджэння; частыя зрывы графікаў прывозу ў камбінат на заняткі вучняў з аддаленых вёсак; недастатковая забяспечанасць неабходнай вучэбна-метадычнай літаратурай. Гэтыя і другія недахопы зніжалі каэфіцыент прафарыентацыйнай аддачы сельскіх ВВК. Так, з выпускнікоў, якія ў 1970–1980-я гг. уключаліся ў сельскагаспадарчую вытворчасць, па спецыяльнасцях, атрыманых у міжшкольных камбінатах, працавалі ад 30% да 40% [7].

Адным з накірункаў працоўнага выхавання школьнікаў і іх арыентацыі на сельскагаспадарчыя прафесіі было ўдасканаленне самога працэсу працоўнай падрыхтоўкі вучняў праз узмацненне практычнай скіраванасці працоўнага навучання і яго сувязі з вытворчым працэсам. Працоўнае навучанне стала праводзіцца ў выглядзе практыкумаў, звязаных з правядзеннем работ і вырошчваннем раслін, неабходных для школы, калгасаў, саўгасаў. У сваіх арганізацыйных формах прадукцыйная праца школьнікаў выступала як вытворчая практыка на прышкольных участках і школьных майстэрнях, часовае ўладкаванне вучняў на працу ў мясцовых гаспадарках у час канікул, вытворчасць прадукцыі ў міжшкольных камбінатах. Але асноўным каналам уключэння школьнікаў у грамадка карысную працу былі вучнёўскія вытворчыя брыгады і звенні, школьныя лясніцтвы, лагеры працы і адпачынку.

У 1976–1985-я гг. партыйныя і камсамольскія арганізацыі рэспублікі прымалі меры па павелічэнню колькасці школьных брыгад, імкнуліся да таго, каб брыгады працавалі круглы год на прынцыпах самакіравання і сацыялістычнага спаборніцтва, каб арганізацыйна яны абапіраліся на эканамічны разлік, поўную механізацыю працаёмкіх працэсаў, дасягненні навукі і передавога вопыту.

Станоўчы вопыт стварэння працоўных аб'яднанняў старшакласнікаў і граматнага кіраўніцтва імі быў накоплены ў Мазырскім раёне. Гэта ў многім садзейнічала таму, што раён меў самы высокі паказчык замацавання выпускнікоў у калгасна-саўгаснай вытворчасці. У 1981 г. у сельскай гаспадарцы раёна засталіся працаваць 50% выпускнікоў сярэдняй школы [8]. Колькасць самастойных працоўных аб'яднанняў сельскіх школьнікаў пастаянна павялічвалася. У 1984 г. у рэспубліцы налічвалася 1700 вучнёўскіх брыгад і больш за тысячу школьных лясніцтваў, у складзе якіх працавалі 141 тысяча вучняў. Акрамя гэтага, дзейнічалі лагеры працы і адпачынку, рамонтныя брыгады, рознаўзроставыя атрады па месцы жыхарства [9].

Працоўныя фармаванні школьнікаў да сярэдзіны 1980-х гг. узмацняліся і арганізацыйна. За імі была замацавана значная колькасць зямельных угоддзяў і сельгастэхнікі, большасць пачалі працаваць на аснове перспектыўных вытворчых планаў, а лепшыя ўвайшлі ў склад мясцовых гаспадарак у якасці аднаго з падраздзяленняў. Аднак высокую эфектыўнасць вытворчага працэсу і арганізацыі самакіравання дэманстравалі дзесяткі вучнёўскіх аб'яднанняў і нямногія з 1700 брыгад толькі набліжаліся да іх узроўню. У большасці калгасаў і саўгасаў на працоўныя фармаванні школьнікаў глядзелі толькі як на некваліфікаваную дапаможную сілу, якую выкарыстоўвалі часова на цяжкіх немеханізаваных работах, а ўся дзейнасць школьнікаў рэгламентавалася распараджэннямі дарослых. Гэта не давала магчымасці ўключыць у вычэбна-выхаваўчы працэс вытворчую працу вучняў у поўным аб'ёме.

**Заключэнне.** Такім чынам, палітэхнізацыя агульнаадукацыйнай школы Беларусі і працоўнае выхаванне вучнёўскай моладзі ў 1976–1985-я гг. у Беларускай ССР вяліся праз умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы працоўнага навучання, удасканаленне самога працэсу працоўнай падрыхтоўкі школьнікаў, развіццё прафарыентацыйнай работы, стварэнне сеткі міжшкольных вучэбна-вытворчых камбінатаў, уключэнне непасрэдна вытворчага працэсу ў сістэму школьнай адукацыі.

## Літаратура

1. Материалы XXVIII съезда Коммунистической партии Белоруссии. – Минск, 1976; Материалы XXIX съезда Коммунистической партии Белоруссии. – Минск, 1981.

2. Настаўніцкая газета. – 1978. – 30 чэрвеня; Народное образование. – 1981. – № 14. – С. 14.

3. Настаўніцкая газета. – 1980. – 13 снежня; Настаўніцкая газета. – 1984. – 9 чэрвеня.

4. Сельские учебно-производственные комбинаты. – М.: Урожай, 1984. – С. 13.

5. Опыт работы учебно-производственных комбинатов БССР. – Минск, 1979. – С. 78–83; Социальное развитие села и школы. – Минск, 1982. – С. 35.

6. Настаўніцкая газета. – 1981. – 12 верасня.

7. Сельские учебно-производственные комбинаты. – М.: Урожай, 1984. – С. 19.

8. Знамя юности. – 1981. – 20 мая.

9. Народное образование. – 1984. – № 10. – С. 17.

*Паступіў 02.04.2010*